

ШТО ЗАМЕЖНІКІ ШУКАЮЦЬ У БЕЛАРУСКІХ САНАТОРЫЯХ

КУДЫ ПРЫВЯЛА СЁЛЕТНЯЯ «ДАРОГА ДА СВЯТЫНЯЎ» 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЖНІЎНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 156 (29023)


**ЛІЧБА ДНЯ**

**36,9 %**

*ад агульнага аб'ёму ўведзенага ў студзені—ліпені жылля прызначана для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці пабудавалі 20,7 тысячы кватэр. Здадзена ў эксплуатацыю 1850,7 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Для чаргавікоў прызначана 682,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 36,9 % ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. Для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі пабудавана 470,5 тысячы квадратных метраў. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 610,5 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля, або 33 % ад агульнага ўводу па краіне.*



# СПАС — УРАДЖАЮ ЧАС



Фота БелТА.

**Свята Праабражэння Гасподняга, якое ў народзе атрымала назву Яблычны Спас, — адно з самых любімых у беларусаў.**

**У гэты дзень не толькі асвячаюцца ў храмах плады новага ўраджаю, але і ладзяцца адмысловыя фэсты. Напрыклад, у Полацку ўчора каля Свята-Пакроўскай царквы прайшоў экафэст, арганізаваны райвыканкамам. Акрамя традыцыйнага малебну з чынам асвячэння, адбылася своеасаблівая выстаўка фруктовых кампазіцый, якія стварылі прадпрыемствы раёна і галоўным матэрыялам якіх былі, канешне, яблыкі.**

*На фота:* **удзельніца свята Ганна ВЯЛЮГА.**

## КОРАТКА

• **Рознічны тавараабарот у Беларусі ў студзені—ліпені вырас на 5,2 %.**

• Школьныя канікулы ў новым навучальным годзе: восеньскія — з 1 да 9 лістапада ўключна; зімовыя — з 26 снежня 2019 года да 11 студзеня 2020 года; вясновыя — з 30 сакавіка да 4 красавіка 2020 года.

• **Беларускія шахматысты занялі другое каманднае месца на кадэцкім ЧС у Мінску.**



• Жыхар Гарадка знайшоў грыб-порхаўку вагой амаль чатыры кілаграмы.


ISSN 1990 - 763X


Сацыяльны клопат

## СЯДЗЕЛКА НЕ АД СЛОВА «СЯДЗЕЦЬ»,

### або Догляд па правілах

**Накормлены, памыты, не пахне... Ці не найлепшы гэта догляд чалавека, прыкаванага да ложка? Да гэтага часу захоўваюцца такія стэрэатыпы пра работу сядзелак, але, як упэўнены работнікі медыка-сацыяльнай службы Беларускага Чырвонага Крыжа, іх трэба тэрмінова мяняць. Попыт на сядзелак ці медсясцёр, якія могуць даглядаць цяжка хворых людзей на даму, пастаянна расце. І калі некалькі гадоў таму такіх спецыялістаў адшукаць было вельмі складана, то сёння ўжо з'явіліся арганізацыі, якія прапануюць такія паслугі. І тым не менш дэфіцыт сядзелак яшчэ не закрыты. Асабліва — падрыхтаваных, навучаных. Часам сваякі рады і таму, што з іх састарэлымі бацькамі хоць якая жывая душа будзе побач. Але чалавек з вуліцы можа сваімі няправільнымі дзеяннямі нават нашкодзіць цяжкахворым пацыентам.**

### Два ў адным

Сёння прыблізна сямі працэнтам беларусаў патрэбна сядзелка, і надалей попыт будзе павялічвацца. Калі ў 2000 годзе 15 працэнтаў састарэлых людзей мелі патрэбу ў медыка-сацыяльнай дапамозе, то цяпер гэта лічба вырасла да 24 працэнтаў. Да гэтай катэгорыі можна дадаць людзей з абмежаванымі магчымасцямі, напрыклад, інвалідаў, у якіх парушаны рухальныя функцыі, асоб з хранічнымі захворваннямі ў складанай стадыі, калі патрэбна ўжо не толькі медыка-сацыяльная, але і паліятыўная дапамога. Запатрабавана сёння і такая паслуга, як «сацыяльная перадышка», калі хоць на некаторы час можна перакінуць на некага клопат пра блізкіх.


СТАР. 4


Наш фармат

## АД САПЕГІ ДА XXI СТАГОДДЗЯ

**Больш за 100 літаратараў з усіх рэгіёнаў краіны возьмуць удзел у мерапрыемствах Дня беларускага пісьменства. Нагадаем, свята, якое ўжо традыцыйна ладзіцца ў першую нядзелю верасня, сёлета прымае Слонім.**

«Дзень пісьменства для нас — безумоўна, вялікае свята, на якім мы сустракаемся са старымі і новымі сябрамі, — зазначае **першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.** — Але разам з тым гэта і справаздача, што зроблена на літаратурнай ніве за мінулы год і за больш доўгі тэрмін. Таму Саюз пісьменнікаў прадставіць у Слоніме самыя значныя свае праекты, у тым ліку міжнародныя».

Ужо 31 жніўня ў слонімскім Доме культуры адкрыецца фотавыстаўка Вячаслава Цыдзіка «Бачу Беларусь такой» — работы з гэтага іміджавага праекта, прымеркаванага да Года малой радзімы, ужо больш за дваццаць пяць разоў экспанаваліся на розных пляцоўках у нашай краіне, а аднайменны паэтычна-мастацкі зборнік летась выйшаў у Выдавецкім доме «Звязда» на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай.

У Слоніме на тэматычнай пляцоўцы «Слова пісьменніка» каля абноўленай кнігарні правядуць першыя творчыя сустрэчы, кніжныя прэзэнтацыі і аўтограф-сесіі, старт якім дадуць прадстаўнікі Гродзеншчыны. Як расказаў намеснік старшыні абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Дзмітрый Радзівончык, галоўнымі «разынкамі» абяцаюць стаць міжнародныя праекты — перакладная польска-беларуская анталогія «Масты», анталогія паэзіі Беларусі, Польшчы і краін Балтыі, сумесны праект з выдаўцамі і літаратарамі Разані — радзімы Сяргея Ясеніна і г. д.


СТАР. 13